*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
3
снежня
чацвер
№ 33(1554)

## БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### КАТОРЫ РАЗ

запрашае студэнтаў адпачыць і набрацца сіл прафілакторый БДУ. Чарговы заезд — з 7 снежня. Усіх, хто жадае набыць пуцёўкі, чакаюць у прафсаюзным камітэце студэнтаў.

І. ВАЛАСЕВІЧ.

### У ВЕЧАРЫ ДРУЖБЫ

(ён адбыўся ў кафэ «Гаўдэамус») актыўны ўдзел прынялі члены дэлегацыі Дзяржаўнага ўніверсітэта г. Чарнаўцы. Самадзейныя артысты выступілі таксама на спартыўным вечары, які прайшоў на днях у БДУ.

Д. ВІЛЬКІН.

### КАНЦЭРТ АЎТАРСКАЙ ПЕСНІ

дасць магчымасць аматарам гэтага жанру сустрэцца з А. Длузскім і У. Бобрыкавым (4, 5, 6 снежня), А. Атаманавым і лаўрэатамі Усесаюзных конкурсаў аўтарскай песні Галінай і Барысам Вайханскімі (5 і 6 снежня). Адбудуцца сустрэчы ў канцэртнай зале Рэспубліканскага Палаца прафтэхадукацыі.

А. МАКСІМАЎ.

*ПРАПАНУЕМ РАЗМОВУ*

## У каго душа баліць

У ВЫШЭЙШЫХ навучальных установах — доўгачаканыя перамены: укараняецца студэнцкае самакіраванне, калектыўная адказнасць за рэзультаты вучобы, ствараюцца студэнцкія кааператывы, цэнтры і клубы навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, аматарскія аб'яднанні па інтарэсах.

Відавочна павысілася актыўнасць у рабоце камсамольскіх арганізацый. Але сёння яшчэ рана заспакойвацца — барацьба з фармалізмам, заарганізаванасцю, усім тым, што зараз прынята называць механізмам тармажэння, толькі пачынаецца.

Аддзел студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМ Беларусі звяртаецца да ўсіх, у каго душа баліць за перабудову, выказаць прапановы, падзяліцца сваімі думкамі наконт перамен, якія адбываюцца ў вышэйшай школе. Ад чаго сення можна адмовіцца ў камсамольскай рабоце, на чым сканцэнтраваць асноўныя намаганні? Чаму ніяк не ўдаецца разварушыць студэнцкую групу? Як прайшлі ў вас справаздачна-выбарныя камсамольскія сходы, канферэнцыі? Што вы можаце сказаць аб рэалізацыі рашэнняў XX з'езда ВЛКСМ?

У адпаведнасці з паступленнем пошты мы мяркуем правесці шэраг дыскусій у студэнцкіх аўдыторыях рэспублікі, прадоўжыць размову на старонках маладзёжных сродкаў інфармацыі.

Будзем лічыць, што дыялог пачаты... Пішыце нам на адрас: 220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 40, аддзел студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМ Беларусі.

А. ДАНІЛАЎ,
загадчык аддзела студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМ Беларусі.

*ДНІ КАФЕДРЫ*



## НАПАМІНАК ПРА НАШЫ ЗАДАЧЫ



У АГУЛЬНАЙ сістэме універсітэцкай філалагічнай адукацыі важнае месца належыць кафедры рускай савецкай літаратуры. Разнастайныя яе задачы і напрамкі дзейнасці, асабліва ў наш час, калі літаратуразнаўства на XXVII з'ездзе КПСС было названа адной з асноўных грамадскіх навук.

У апошнія гады мы сталі сведкамі паяўлення многіх літаратурных твораў, якія прыцягнулі ўвагу чытачоў. Іх у нас называюць «кнігамі, пра якія спрачаюцца». У вялікім патоку публікацый, што абрушваецца на чытача са старонак часопісаў, побач з бясспрэчнымі дасягненнямі — успомнім імёны В. Распуціна, В. Астаф'ева, Д. Граніна — сустракаюцца раманы, аповесці, вершы дастаткова супярэчлівыя, часам проста памылковыя па сваёй накіраванасці. Асабліва патрэбна запярэчыць супраць лёгкай, нізкапробнай чытаніны, няправільнага адлюстравання нашай гісторыі. Сучасная эпоха галоснасці, шырокага дэмакратызму не азначае безагаворачнага прыняцця ўсяго надрукаванага, наадварот — яна патрабуе асаблівай уважлівасці, кампетэнтнасці.

Кафедра савецкай літаратуры імкнецца быць на вышыні задач часу.

Нельга не ўпамянуць тут нашых фалькларыстаў. Штогод пад кіраўніцтвам выкладчыкаў накіроўваюцца студэнты ў вёскі Брэстчыны, Гомельшчыны на пошукі скарбаў народнай культуры. Вынікамі такіх экспедыцый з'яўляюцца запісаныя песні, казкі, звычаі, знаёмства з іх стваральнікамі. Матэрыялы пасля апрацоўкі ўваходзяць у зборнікі, выкарыстоўваюцца ў вучэбных мэтах.

Кафедра імкнецца расшырыць кантакты з іншымі ВНУ рэспублікі. На яе базе штогод праходзяць рэспубліканскія семінары выкладчыкаў ВНУ. Супрацоўнікі кафедры за апошнія гады былі ўдзельнікамі навуковых канферэнцый, якія праходзілі ў Чарапаўцы, Ленінградзе, Тбілісі, Новасібірску, Сімферопалі, Кіеве, Вільнюсе, Іванаве.

Сумесная работа над планавай тэмай па стварэнню вучэбнага дапаможніка па сучаснай літаратуры аб'яднала нас з калегамі з Йенскага універсітэта (ГДР). Думаецца, наша супрацоўніцтва будзе плённым і перспектыўным. Кафедра рускай савецкай літаратуры — гэта шаснаццаць чалавек рознага ўзросту, жыццёвага вопыту, навуковых інтарэсаў, аб'яднаных адным лёсам — выкладчыцкім. Немагчыма ў рамках газетнай заметкі ахарактарызаваць уклад кожнага члена кафедры ў агульную справу... І ўсё ж назавём ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны дацэнтаў В. А. Захараву, С. А. Лысенка, У. С. Карабана, Г. Д. Сіненку, якія звязалі сваё жыццё з кафедрай.

Нагодай для напісання гэтых радкоў з'явіліся дні кафедры савецкай літаратуры, якія праходзілі нядаўна на філалагічным факультэце. Сярод іх дні: школы, тэатра, фальклору, паэзіі, навукі, інтэрнацыянальнай дружбы... Словам, яны ўключылі align="right">рознабаковыя мерапрыемствы вучэбнага, выхаваўчага, навуковага характару і з'явіліся праверкай магчымасцей калектыву, напамінкам аб нашых новых задачах.

І. КАХНО,
прафесар, загадчык кафедры рускай савецкай літаратуры.

Загадчык лінгафоннай лабараторыі філфака Г. ЮРЧАНКА зрабіў гэтыя здымкі на дні інтэрнацыянальнай дружбы.

## Аб'яднае літаратура

РАЗНАСТАЙНАЙ і змястоўнай была праграма дзён кафедры рускай савецкай літаратуры, якія нядаўна завяршыліся на філалагічным факультэце.

Своеасаблівым пачаткам дзён паслужыла лекцыя прафесара І. П. Кахно «Эстэтычныя погляды У. І. Леніна», якая выклікала значную цікавасць у выкладчыкаў і студэнтаў.

Увагу аматараў драматычнага мастацтва прыцягнуў праведзены на факультэце дзень тэатра, на якім выступіў рэжысёр тэатра імя Я. Купалы М. Пінігін. Адбылася шчырая гутарка аб праблемах, якія хвалююць творчы калектыў, літаратуразнаўцаў і гледачоў, аб перспектывах купалаўцаў.

Студэнцкая канферэнцыя «Імёны, якія вярнуліся ў літаратуру» адкрыла дзень паэзіі.

«Мір», «салідарнасць», «братэрская дапамога» — гэтыя словы часта гучалі на розных мовах у дзень інтэрнацыянальнай дружбы, на якім замежныя студэнты, што вучацца на філфаку, сустрэліся са слухачамі Вышэйшага палітычнага вучылішча, якія яшчэ нядаўна выконвалі інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. Расказы капітанаў А. Моршчанкі, В. Сіненкі і старшынь братоў В. і М. Быстрыцкіх, сапраўдныя і простыя, выклікалі гарачыя, доўга не сціхаўшыя апладысменты.

Лекцыя «Новае пра М. Булгакава», прачытаная дацэнтам І. С. Скарапанавай, дапамагла многім нібы нанава адкрыць для сябе творчасць выдатнага савецкага пісьменніка.

Яркім атрымаўся фальклорны вечар у Палацы Белсаўпрофа.

Выкладчыкі кафедры выступілі з лекцыямі пра сучасную савецкую літарутуру ў цэхах, інтэрнатах, у Палацы культуры Мінскага аўтазавода.

Адкрытае пасяджэнне кафедры было прысвечана памяці прафесараў І. В. Гутарава, Л. І. Фіглоўскай і дацэнта Н. М. Рамашкі.

Г. ЮРЧАНКА.

*А Ў НАС! А Ў ВАС?*

## Тэледыялог працягнецца




**УВАГА!**

На трэцяй старонцы газеты глядзіце і чытайце матэрыял аб тэлемосце паміж студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна і Кракаўскага універсітэта.





# Народны кантроль у дзеянні

* ЦІ ДАЧАКАЕМСЯ ЗМЕН?
* УЛІЧВАЮЧЫ ВОПЫТ МІНУЛАГА ГОДА.
* — НЕ ЎСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД МЯНЕ.
* ЯК БЕНЗІН ПЕРАТВАРЫЎСЯ Ў ПАВЕТРА.

ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

## Рыхтуй сані...

ІМЕННА ТАК і атрымліваецца ў сапраўдных гаспадароў: і да зімовай сцюжы, і да летняй спякоты рыхтуюцца яны заўжды загадзя. Чаго нельга сказаць аб асобных прадпрыемствах і арганізацыях раёна, чые кіраўнікі з году ў год не робяць належных вывадаў з мінулых урокаў, безадказна падыходзяць да падрыхтоўкі сваіх гаспадарак да работы і эксплуатацыі ў зімовы перыяд. Так, у вучэбна-навуковым камбінаце трэста «Будмеханізацыя» забыліся распрацаваць план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы будынкаў і камунікацый. Патрэбны капітальны рамонт цеплатрасы.

Нялёгка прыйдзецца і вадзіцелям ВВТК трэста «Белэлектрамантаж», таму што ацяпленне пакояў для адпачынку яны, пэўна, так і не дачакаюцца.

Не закончаны работы на цеплатрасе працягласцю 80 метраў ва ўпраўленні «Аграхарчпром». Не звяртае ўвагі на стан сістэмы ацяплення і кіраўніцтва БМУ «Мінскрадыёбуд». На Мінскім транспартным прадпрыемстве аблспажыўсаюза не адрамантаваны два катлы кацельнай, не ўцеплены гараж, у дрэнным стане знаходзіцца асфальтавае пакрыцце. Не складзены планы і графікі падрыхтоўкі будынка да зімы, не адрамантаваны дах, адсутнічае вентыляцыя на складзе фарбаў у інстытуце «Мінскпраект».

Тры службы з шасці Мінскага метрапалітэна не падалі акта гатоўнасці. Ніяк не падрыхтуюцца да сустрэчы з зімой у інстытуце «Белаграпраект», дзе яшчэ не заключылі дагавор з дарожным участкам, няма снегазборнага інвентару. Інстытутам «Мінскграмадзянпраект» не адрамантаваны дах, у нездавальняючым стане знаходзіцца халоднае і гарачае водазабеспячэнне. Не скончана выпрабаванне цеплатрасы, будаўніцтва крытага гаража, не працуюць душавыя на аўтабазе Мінскай гарадской канторы Дзяржбанка.

На пералічаных прадпрыемствах існуе не па аднаму адказнаму за падрыхтоўку да зімы. Толькі чамусьці справы пад кіраўніцтвам А. І. Мацюша, Н. А. Мораха, І. А. Ткачэні, У. Я. Мацвеянкова, Г. В. Жулегі, Л. А. Ціглера, В. І. Мацюхіна, І. Н. Лабачова, А. Б. Чаброўскага, І. П. Цярэшчанкі, П. Н. Палюховіча з месца не рушацца. А за вокнамі іх цёплых кабінетаў ужо некалькі дзён, як ідзе зіма. Ці дачакаемся змен?

ЯК ЖЫВЕШ, ШНК?

## КАНТРАЛЁР ІДЗЕ Ў ШКОЛУ

**У раёне створана 355 школ народных кантралёраў. Гэта азначае, што практычна ўсе народныя кантралёры ў 1986—1987 навучальным годзе былі ахоплены вучобай. Партыйнымі арганізацыямі на месцах падабраны і зацверджаны кіраўнікі і прапагандысты школ, вызначаны адзіны дзень вучобы народных кантралёраў у раёне і на месцах. Пытанні камплектавання ШНК разгледжаны на сходах груп.**

УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ яшчэ ў мінулым годзе, калі арганізацыйнымі і галіновымі аддзеламі камітэта былі праведзены семінары-нарады са старшынямі груп народнага кантролю, на якіх быў глыбока прааналізаваны вучэбны працэс мінулага года, унесены канкрэтныя заўвагі і прапановы па ўдасканаленню заняткаў, фарміраванню школ у кожнай групе.

Вялікую ролю ў правядзенні заняткаў адыграў метадычны савет раённага камітэта. Ён забяспечыў усе школы народнага кантролю тэматычнымі планамі вучобы, журналамі ўліку заняткаў. З гэтай жа мэтай у метадычным кабінеце камітэта быў створаны раздзел «У дапамогу кіраўнікам і прапагандыстам школ народных кантралёраў». Тут праводзяцца кансультацыі і інструктаж па ўсіх пытаннях арганізацыі заняткаў і чытанню лекцый.

Аналіз вучобы народных кантралёраў сведчыць пра тое, што ў большасці груп новы навучальны год прайшоў арганізавана, заняткі праводзіліся на належным тэарэтычным і практычным узроўні.

Большасць кіраўнікоў і прапагандыстаў школ умела звязвалі тэмы, якія вывучалі, з задачамі, што стаяць перад працоўнымі калектывамі. Аб перабудове, якая адбываецца ў краіне, ішла размова на занятках на тэму «На магістральных шляхах паскарэння». Шырока выкарыстоўвалі прапагандысты мясцовы матэрыял, прыводзілі прыклады станоўчых вынікаў і недахопаў, якія, на жаль, яшчэ існуюць, указвалі шляхі і метады іх ліквідацыі.

Арганізавана, на належным тэарэтычным узроўні праводзілася вучоба народных кантралёраў на шчацінна-шчотачнай фабрыцы. Тут з вялікай цікавасцю ставяцца да яе правядзення кіраўнікі прадпрыемства. Прапагандыстамі школы народных кантралёраў з'яўляюцца дырэктар фабрыкі Н. А. Навіцкі, галоўны інжынер В. В. Сарадулаў, намеснік дырэктара Л. П. Дастанька і іншыя кіраўнікі. Заняткі цесна звязваюцца са станам спраў на прадпрыемстве і ў калектыве, ілюструюцца прыкладамі. У выніку большасць народных кантралёраў праяўляюць актыўнасць, выкарыстоўваюць веды ў сваёй рабоце.

Станоўчай адзнакі заслугоўвае арганізацыя вучобы народных кантралёраў на вытворчых аб'яднаннях «Белмедпрэпараты», «Будмаш», МВАА «Прамень», фабрыцы № 2, у педагагічным інстытуце, НДІ будматэрыялаў і многіх іншых.

Між тым, у асобных калектывах вучоба народных кантралёраў праводзілася не на належным узроўні, а часам і зусім зрывалася. Некаторыя кіраўнікі школ без падстаў пераносілі заняткі. Нярэдка прапагандысты слаба валодалі вучэбным матэрыялам, у час заняткаў выкладалі тэмы шляхам чытання рэкамендаваных КНК БССР распрацовак з часопіса «Народное хозяйство Белоруссии» без сувязі іх з задачамі калектыву.

У шэрагу школ хранічна не хапала наведвальнікаў. Чаму? Аб гэтым трэба падумаць прапагандыстам упраўлення «Белпрамселькамплект» РБУ-17, тытунёвай фабрыкі, Рускага драматычнага тэатра. І перагледзець метады выкладання. Каб не губляць сувязі са слухачамі, дапамагчы зрабіць жыццё груп народнага кантролю больш дзейсным і цікавым.



Матэрыялы паласы да друку падрыхтавала М. ЗАГОРСКАЯ, наш карэспандэнт.
Калаж В. ЧАРНЯЎСКАГА.

НК У ДЗЕЯННІ

## Сумныя вынікі адной праверкі

ЗДАРЫЛАСЯ так, што сорак літраў бензіну самым сапраўдным чынам ператварыліся на паперы ў паветра. Чараўнік з вялікім стажам работы і той бы пазайздросціў работнікам бухгалтэрыі навукова-вытворчага аб'яднання «Жылкамунтэхніка», якія пры вывядзенні рэштказ улічылі толькі трыццаць літраў бензіну замест атрыманых вадзіцелем В. В. Люцько сямідзесяці. Застаецца толькі здагадвацца, як скарыстаў для сябе гэтую памылку сам вадзіцель.

Такі факт быў выяўлены ў ходзе праверкі выкарыстання гаруча-змазачных матэрыялаў на прадпрыемствах і ў арганізацыях раёна.

У выніку бескантрольнасці з боку бухгалтэрыі ў парушэнне інструкцыі Мінфіна СССР «Па ўліку паступлення і расходавання гаруча-змазачных матэрыялаў і адзіных талонаў на водпуск нафтапрадуктаў на прадпрыемствах, у арганізацыях, калгасах і саўгасах» спісанне гаруча-змазачных матэрыялаў праводзілася па нормах, аднак без уліку фактычнага расходу. Вынікі? За 1986 і частку бягучага года дапушчаны перапал і перапісанне 1063 літраў бензіну.

Запаўненне і апрацоўка пуцявых лістоў тут праводзіцца з грубымі парушэннямі патрабаванняў інструкцыі. Дапускаюцца шматлікія выпраўленні паказанняў спідометра і рэштказ бензіну. Як думаюць адказныя работнікі кантраляваць работу аўтатранспарту, калі не ўказваюцца ў галоўным дакуменце ні канкрэтныя пункты назначэння, ні адлегласць паміж імі?

У аб'яднанні не распрацаваны мерапрыемствы па эканоміі гаруча-змазачных матэрыялаў, не ўкаранёна прэміяльная сістэма за іх эканомію і ўтрыманне з вадзіцеляў, якія дапусцілі перапал, вартасці гаручага. Аналагічныя недахопы пры выкарыстанні гаруча-змазачных матэрыялаў устаноўлены і на вопытным заводзе «Белспецкамунмаш».

Парушаюцца патрабаванні вышэйстаячых органаў аб строгім прытрымліванні лімітаў выкарыстання гаручага на службовым легкавым аўтатранспарце ў Мінскім спецыялізаваным мантажна-наладачным упраўленні ВНВА сцёкавых і вяжучых матэрыялаў. Устаноўлены месячны ліміт выкарыстання гаручага на службовым легкавым аўтамабілі перавышаўся ў студзені мінулага года на 236 літраў, лютым — 111, чэрвені — 214, жніўні — 192, верасні — 153 літры.

За недастатковы кантроль за выкарыстаннем гаруча-змазачных матэрыялаў галоўнаму бухгалтару НВА «Жылкамунтэхніка» А. І. Чумаковай аб'яўлена вымова. Пакараны за непрытрымліванне ўстаноўленых лімітаў на службовым легкавым аўтамабільным транспарце бухгалтар І. М. Гукеніс. Але ёсць у гэтай справе і «ускосныя» віноўнікі. Гэта члены груп народнага кантролю указаных прадпрыемстваў і устаноў. Калі пачнуць яны праводзіць належны кантроль за правільнасцю і эфектыўнасцю выкарыстання гаруча-змазачных матэрыялаў?

ПЫТАННЕ ЗАСТАЕЦЦА НА КАНТРОЛІ

## Меры прыняты?

«ПА-РАНЕЙШАМУ не вырашаны пытанні, звязаныя з паточнымі аўдыторыямі 284 і 482. Прынятых мер відавочна недастаткова. Вокны ў гэтых аўдыторыях брудныя, уцяпленне шчылін ватай неабходных вынікаў не дае. Такім чынам, трэба чакаць, што зімой тут зноў будзе марозна».

Вось такія сумныя вывады зрабіла камісія народнага кантролю, аддзелаў матэрыяльнага забеспячэння і быту і захавання сацыялістычнай маёмасці, «Камсамольскага пражэктара» універсітэта пры праверцы гатоўнасці фізічнага факультэта да эксплуатацыі ў зімовых умовах. Чаму сумныя? Таму што з году ў год, з даведкі ў даведку пераходзяць славутыя аўдыторыі №№ 284, 482. Доўгі час гуляюць у хованкі прадстаўнікі служб, адказных за справу, а студэнты і выкладчыкі вымушаны зімаваць у складаных умовах, калі па паказаннях градуснікаў у аўдыторыі заўсёды ніжэй нуля. А як на іншых факультэтах, у інтэрнатах універсітэта? Адміністрацыйна-гаспадарчай часткай універсітэта праведзена значная работа ў гэтым напрамку. Зроблены планава-папераджальны рамонт усяго электраабсталявання і вентыляцыйных установак, праведзена праверка падрыхтоўкі ўнутраных сістэм ацяплення, цепла- і водазабеспячэння. Але ж і недахопаў засталося яшчэ шмат.

Не будзем пералічваць аўдыторыі, дзе адсутнічаюць фрамугі і шкло ў знадворных рамах акон. Скажам толькі, што ў большай ступені гэта хвароба характэрная для галоўнага корпуса, карпусоў хімічнага, біялагічнага, фізічнага факультэтаў.

Практычна ў кожным інтэрнаце разбітае шкло і неаклееныя да гэтае пары вокны з'яўляюцца як бы неабходным атрыбутам. Возьмем, напрыклад, інтэрнат № 5, дзе няма шкла ў вокнах у пакоях №№ 314, 318, 412, 417, 545, нельга нават паспрабаваць закрыць рамы ў пакоях №№ 452, 537, 530. Не аклеены вокны ў пакоях №№ 443, 452, 530, 532, 534, 544, 552 і многіх іншых.

— Гэта што! — сумна ўсміхнуліся, пачуўшы пра такія непаладкі, жыхары пакоя № 1101 б сёмага інтэрната, дзе зусім няма шкла. У студэнцкай сям'і, што жыве ў пакоі 1010 а сіл нават на такую ўсмешку ўжо не хопіць. Якія могуць быць жарты, калі з-за зломанай аконнай рамы тэмпература не падымаецца вышэй 10—12 градусаў! А ў пакоі ж знаходзіцца зусім маленькае дзіця.

Каменданты інтэрнатаў скардзяцца на студэнтаў. Мы згодны, што нярэдка шкло разбіваецца студэнтамі. І тое, што ў 50 працэнтаў жылых пакояў інтэрната № 3 не аклеены вокны, таксама нельга ставіць у віну кіраўніцтву.

Але часам здараецца, што звяртаюцца студэнты за дапамогай, а ў кіраўніцтва да навядзення парадку ўсё не даходзяць рукі. Ці не зняважлівымі адносінамі адказных служб тлумачыцца тое, што ў пакоях №№ 509 б, 1011 а, 1015 а інтэрната № 2 ужо не першы дзень існуюць няспраўныя разеткі? Што не працуе душ у блоках 315, 407, 412, 505, 512, 1014, 1015?

Нехта ж павінен вырашаць своечасова і гэтыя пытанні.

В. ЛЫСАК,
кіраўнік аддзела матэрыяльнага забеспячэння і быту.
Г. ШУМАК,
кіраўнік аддзела захавання сацыялістычнай маёмасці.
Д. ОРЛІК,
старшыня штаба «КП».

**АД РЭДАКЦЫІ. На чарговым пасяджэнні камітэта народнага кантролю разглядалася пытанне аб гатоўнасці вучэбных карпусоў і інтэрнатаў універсітэта да эксплуатацыі ў зімовых умовах. Былі запрошаны В. Г. Валпянскі, начальнік гаспадарчага аддзела АГЧ, і дырэктар студэнцкага гарадка А. С. Глагольеў.**

**— Я сапраўды адказны, як гаворыцца, за энергію і цяпло,— сказаў В. Г. Валпянскі. Але ж не ўсё залежыць іменна ад мяне. Не магу адказваць за службы механіка і энергетыка.**

**Такім чынам, пытанне ўсё яшчэ не вырашана і будзе разглядацца на наступным пасяджэнні КНК.**

# ТЭЛЕДЫЯЛОГ ПРАЦЯГНЕЦЦА

ЗА КАФЕДРУ падняўся ў рэктарскай мантыі... студэнт і прамовіў:

— У нас няма сродкаў на рамонт старых карпусоў (а яны пабудаваны ў 1364 годзе). Рэдкасная бібліятэка ўжо некалькі разоў затаплялася і ў яе памяшканні самы час разводзіць шампіньёны.

— А ў нас знізіўся конкурс пры паступленні, ды і якасць падрыхтоўкі спецыялістаў таксама.

— А яшчэ ў нас...

Гэтую ўмоўную сітуацыю са студэнтам у ролі рэктара мы прапанавалі нашым кракаўскім сябрам спецыяльна, каб хутчэй развязаць дыялог. Першы крок зроблены — у адказ яны пачынаюць шчыра расказваць пра свае набалелыя пытанні і цікавяцца: «А як у вас?»

А ў нас, як вы ведаеце, таксама не без студэнцкіх праблем, і многія з іх аднолькавыя ў сваёй сутнасці з польскімі: і аб кватэрах маладым спецыялістам даводзіцца толькі марыць, і стыпендыі не хапае — трэба падрабляць.

Сапраўдным адпраўным пунктам для дыскусіі аказалася пытанне аб размеркаванні. Справа ў тым, што для польскіх студэнтаў гэтага пытання амаль не існуе — па эканамічных прычынах яны не працуюць па спецыяльнасці, а ідуць у кааператывы. «Ды мне пайсці працаваць настаўнікам — раўназначна самагубству»,— было і такое шчырае выказванне. Таму з іх боку прагучала прапанова аб «свабодным» працаўладкаванні і нават такое недарэчнае пытанне: «Ці не лічыце вы, што існуючае ў вас «прымусовае» размеркаванне з'яўляецца ўшчамленнем свабоды асобы?».

Наогул, бурныя воплескі ў польскай аўдыторыі выклікалі пытанні, у якіх прама ці ўскосна закраналіся перабудова, дэмакратыя, галоснасць. А галоснасць лепей за ўсё праяўлялася тады, калі гаварыць надыходзіла наша чарга. Аднолькавых адказаў не было зусім. На любое пытанне — мноства розных поглядаў. Кожны казаў тое, што думаў, а часам — было і такое — не паспеўшы добра падумаць. Дапаўнялі адзін аднаго, удакладнялі, а нярэдка і аспрэчвалі.

Адразу пасля запісу перадачы мы палічылі пралікам, што ў студыі сабралася столькі незнаёмага, «неправеранага» народу (былі актывісты з усіх факультэтаў БДУ); мы слаба падрыхтаваліся — і таму атрымаўся кавардак, паміж сабой іншы раз не маглі знайсці агульнай мовы, не тое што з палякамі. А цяпер, праз час, думаю, што былі ў такіх экспромтных пытаннях-адказах і свае плюсы: людзі разважалі, нават памыляліся, гаварылі не заўсёды тое, што ад іх можна было чакаць, але гаварылі сваё асабістае меркаванне, адстойваючы свой пункт гледжання.

Польскай аўдыторыі, наадварот, не хапала раскаванасці. Мікрафон бралі часцей за ўсё асобы з рэктарата ці ўжо знаёмы студэнт-рэктар. І толькі пасля нашага намёку на пасіўнасць аўдыторыі мы ўрэшце ад «простых» студэнтаў даведаліся пра іх сапраўднае жыццё. Напрыклад, нам было цікава паслухаць пра тое, што польскі студэнт мае магчымасць некалькі гадоў займацца на адным і тым жа курсе; пра дарагія падручнікі (15 рублёў); пра заробак маладых спецыялістаў, ніжэйшы нават за стыпендыю; пра недахоп лабараторый і слабую сувязь ВНУ з прадпрыемствамі...

А калі надышоў час дзяліць прызы паміж самымі актыўнымі ўдзельнікамі тэлемоста (конкурс быў аб'яўлены ў пачатку перадачы) — на ўсеагульны агляд былі прадстаўлены электронны гадзіннік мінскага аб'яднання «Прамень», пласцінкі з запісамі «Сяброў», «Верасоў», У. Высоцкага. Узнагароджанымі аказаліся амаль усе, хто актыўна ўдзельнічаў у размове.

В. КАРАЛЕНКА.




ДЛЯ ДАВЕДКІ. Запіс тэлемоста «Мінск — Кракаў» адбыўся 19 лістапада. Для жадаючых паглядзець яго па БТ, прапануем сачыць за праграмай тэлеперадач.
Фотакалаж А. МАКСІМАВА.

*СЕМІНАР-ВУЧОБА КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ*

# Рэалізаваць у справах

**27—29 лістапада на базе піянерскага лагера «Гарызонт» (пад Радашковічамі) прайшоў семінар-вучоба камсамольскага актыву універсітэта, медыцынскага і педагагічнага інстытутаў.**

ДЛЯ ТЫХ, хто сабраўся пад Радашковічамі, пятніца стала пачаткам камсамольскай вучобы. Штогод збіраюцца пасля выбараў члены камітэтаў камсамола ВНУ, факультэтаў на семінары, на якіх выпрацоўваецца тактыка работы на год, аналізуюцца пралікі, шукаецца калектыўна выйсце з узнікаючых праблемных сітуацый. Алег Чулкоў, загадчык студэнцкага аддзела Мінскага абкома ЛКСМБ, так ахарактарызаваў сёлетнюю вучобу:

— Наша вучоба носіць установачны характар. Мы будзем чакаць вынікаў «знізу». Як на практыцы камсамольскі актыў ажыццёвіць вынесенае з нашых лекцый, семінараў, такім будзе і працэнт эфектыўнасці гэтых дзён. Галоўная ж мэта такіх міжвузаўскіх сустрэч актыву — зблізіць ВНУ, завязаць дзелавыя сувязі, навучыцца адзін у аднаго.

Вучэбны семінар быў даволі насычаным. Працавала пяць секцый. Суботнія і нядзельныя пасяджэнні былі поўнымі спрэчак, патрэбнай, асабліва для пачынаючых, інфармацыі. Сёлета арганізатары адмовіліся ад вялікай колькасці лекцый, як гэта было ў мінулым годзе. Калі ідзе абмен думкамі паміж людзьмі, што вядуць у камітэце камсамола пэўны напрамак работы, то кожны для сябе можа рашыць і свае пытанні, і навучыцца працаваць у іншых.

На секцыі адказных за інтэрнацыянальную работу, якой кіраваў намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэррабоце Аляксандр Самуйліч, правялі анкету і тэстыраванне для выяўлення ўзроўню падрыхтаванасці да работы намеснікаў сакратароў камітэтаў камсамола факультэтаў па інтэррабоце. Праблем у інтэрактыву шмат як з замежнымі студэнтамі, так і з савецкімі. Успаміналіся лепшыя формы работы ў гэтым напрамку ў БДУ, МДПІ, МДМІ. Іна Войціхава (гістарычны факультэт БДУ імя У. І. Леніна) лічыць, што ў інтэррабоце галоўнае — зацікавіць замежных студэнтаў. Інтэрактыў гістфака — 16 чалавек. З іх толькі палова сапраўды актывісты, на якіх Іна можа разлічваць заўсёды.

— Трэба выяўляць таленты ў нашых замежных студэнтаў, часцей праводзіць сумесныя мерапрыемствы. Арганізоўваць іх так, каб замежнікі адчувалі, што гэта і іх справа, а не толькі наша. Мы вось рыхтуем факультэцкі КВЗ, у якім будуць удзельнічаць савецка-польская і савецка-нямецкая каманды. Плануем праводзіць сумесныя інтэрвечары з мехматам, геафакам.

У размову ўключаецца намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэррабоце філалагічнага факультэта Таня Скакун.

— Савецкіх студэнтаў таксама трэба зацікавіць. Мала проста запрашальны білет на інтэрвечар даць. Трэба настойліва прыцягваць да падрыхтоўкі таго ж вечара. Хочацца сказаць пра інтэрнат, дзе для інтэрнацыянальнага выхавання шмат прасторы. Узяць такое пытанне, як сумеснае пражыванне з замежнымі студэнтамі. Нельга чалавека сілай прымушаць жыць з тым, з кім ён не хоча. На філфаку мы падбіраем людзей для пражывання ў інтэрпакоях, улічваем асабістае жаданне.

А тым часам на другім паверсе ў холе працуе секцыя намеснікаў сакратароў па арганізацыйнай рабоце і старшынь «Камсамольскага пражэктара». Барыс Лысякоў, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па аргрnative, адказны за секцыю, задаволены. Задаюцца канкрэтныя пытанні, ёсць аб чым паспрачацца. Гавораць рабяты і пра выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі ў аргрnative, і пра тое, што шмат папер... Святлана Надырка (юрфак) заўважыла ў перапынку, што не пашкодзіла б правесці сустрэчу з выкладчыкамі нашай рэспубліканскай камсамольскай школы, бо ў арганізацыйнай рабоце не толькі практыка важную ролю іграе, але і тэорыя («Трэба ж ведаць, што я маю права рабіць, а што не»).

Калі спусціцца паверхам ніжэй, то трапляеш у дзелавую абстаноўку секцыі адказных за штабы працоўных спраў. У Васіля Бойкі, старшыні ШПС універсітэта і адказнага за гэтую секцыю, ёсць шмат прапаноў, заўваг. І аб тым, што: трэба разабрацца з падборам камандзірска-камісарскага саставу. І не забыцца на інтэратрады. І чаму мы імкнёмся ўсё больш недахопы, пралікі разбіраць, а ўзнагародзіць людзей забываем ці то баімся звяртацца з прапановамі аб узнагароджанні вышэйстаячымі камсамольскімі органамі? Прыводзяцца прыклады, называюцца канкрэтныя адрасы, а таму і ідзе прадметная размова, з якой можна і для сябе нешта вынесці.

Бадай, часцей за іншых не ўкладваліся ў рэгламент работы секцый ідэолагі. Яны разам з адказнымі за шэфскую і ваенна-патрыятычную работу паспелі абмеркаваць шэраг пытанняў: правядзенне ГПА, палітзаліку, педатрады, АКАД, работа сектара друку. І вакол кожнага — спрэчкі. Было відаць, што кіраўніку секцыі, намесніку сакратара па ідэалагічнай рабоце БДУ Сяргею Балашэнку такі настрой рабят падабаецца. Мы не можам аддзяляць ідэалагічнае выхаванне ад іншых сектараў камітэта камсамола. Тут павінен быць самы цесны кантакт. У блакнотах з'яўляліся запісы, што можна зрабіць новага, куды звярнуцца з вырашэннем таго ці іншага пытання. І не спяшаліся разысціся ідэолагі, у перапынках абмяркоўвалі ўзнятыя пытанні.

Сакратарам камітэтаў камсамола факультэтаў і патокаў прыйшлося вытрымаць выпрабаванне холадам. Актавая зала не тапілася, але ў ёй было горача ад спрэчак. Аляксандр Жук, сакратар камітэта камсамола універсітэта, і Алег Чулкоў ледзь паспявалі адказваць на пытанні, што сыпаліся на іх. Сакратароў цікавіла ўсё: самакіраванне, фінансы камсамола, адпачынак моладзі, пытанні арганізацыі кантролю і выканання...

А. Жук пасля апошняга пасяджэння адзначыў:

— Папрацавалі плённа. Калі ўлічыць, што большая палова прысутных — упершыню выбраныя сакратары, то карысць дзелавой нашай размовы відавочная. Добра, што ў гэтым годзе ў нас больш было практычнай, секцыйнай работы. У многіх секцыях выступалі прадстаўнікі Маскоўскага райкома ЛКСМБ. Цікава пра збор воінаў запасу ў Ашхабадзе, работу гарадскога клуба воінаў-інтэрнацыяналістаў «Памяць» расказаў член савета клуба, студэнт юрфака Юра Бацян...

Прыходзіцца ставіць шматкроп'е, бо месца ў газеце абмежавана, а расказаць хочацца пра многае. Не толькі паасобку працавалі ўдзельнікі семінара. Разам сабраліся яны на сустрэчу з сакратаром ЦК ЛКСМБ М. В. Падгайным. Міхаіл Васільевіч адказаў на пытанні актыву трох буйных ВНУ горада. Гаворка ішла пра мэтавыя планы, падбор кадраў, пра тое, на што сёння ў першую чаргу звяртае ўвагу ЦК ЛКСМБ.

Цікавымі былі лекцыі па сацыяльнаму зместу перабудовы і міжнародных, савецка-амерыканскіх адносінах, з якімі выступілі выкладчыкі БДУ і медінстытута А. Грыцанаў і У. Велічанаў. Хоць і выступалі лектары адзін за адным, але іх лектарскі ўзровень настолькі вялікі, што не заўважылі мы стомы. «Як на адным дыханні гавораць»,— пачулася побач.

Не хачу, каб склалася ў чытачоў памылковае ўяўленне пра семінар: маўляў, лекцыі, семінары, і ўсё? Актыў не толькі вучыўся, але і адпачываў. Дэманстраваліся новыя дакументальныя фільмы «Бумеранг» і «Акцыя», якія расказваюць пра праблемы наркаманіі і неафашызм. А ці можна не ўспомніць канцэрт, што нарадзіўся экспромтам? Такая простая, студэнцкая атмасфера была ў зале, што ёй бы пазайздросціла любая зорка эстрады. Рабяты з універсітэта адкрылі відэасалон «Аэрапорт»: амерыканскі фільм, музычная праграма, кліпы, серыял мультфільмаў спадабаліся ўдзельнікам семінара. А як весела, задорна танцавалі мы на дыскатэках, спявалі пад гітару песні! Новыя знаёмыя, спрэчкі, сумесная работа аб'яднала ўдзельнікаў семінара.

...Развітваліся з гасцінным лагерам. Што запомнілася?

Лёня Марковіч, сакратар камітэта камсамола фізфака:

— Дух семінара. Не такі ж камсамол наш інфантыльны.

Света Кавальчук, член камітэта камсамола факультэта журналістыкі:

— Мы мелі магчымасць у неафіцыйных абставінах, па-за кабінетам пагаварыць, паспрачацца. А гэта дае многае і ў тэарэтычным, і ў практычным плане.

Люда Абрамава, намеснік сакратара па інтэррабоце фізічнага факультэта:

— У гэтым годзе цікавей было. Пытанні людзі самі задаюць, значыць, хвалюе, значыць, настрой на работу ёсць. У каго ж яму быць, калі не ў актывіста!

Настрой нашага актыву радуе. Застаецца толькі рэалізаваць гэты настрой у канкрэтных справах. Застаецца проста працаваць.

С. ГОГАЛЬ.





ТУРЫСЦКІМІ СЦЕЖКАМІ

# 2. ТУДЫ, ДЗЕ ГАРЫЗОНТА МЯЖА

*(Заканчэнне. Пачатак у № 31 за 19 лістапада).*

### АД ПЕРАВАЛА ДА ДАЛІНЫ ПРЫВІДАЎ. 4.XI.87.

НА МЕТЭАСТАНЦЫІ дзяўчаты з групы Лашука пакінулі свайго ката Гематагена.

— Няхай жыве,— прамовіла на развітанне загадчыца.— У мяне ўжо адзінаццаць такіх падарожнікаў сабралася.

Перавал Ангарскі. 762 метры над узроўнем мора. Павольна падымаюцца на яго машыны, яшчэ павольней паўзём мы.

Група Дубовіка наблізілася да Даліны Прывідаў. Вялізная хмара закрыла вяршыню гары Дземерджы, знізу не відаць амаль нічога.

— Ні ў якім разе нельга зараз уверх ісці! — пляснула ў далоні адна бабулька.

— Не бойцеся, сыночкі, якраз да цемры паспееце ўсё паглядзець і ўніз спусціцеся,— выказала праз некалькі мінут сваю думку другая.

Дубовік некаторы час разважае, падымаецца крыху вышэй, пакідае сваіх таварышаў разбіваць лагер, а сам з некалькімі хлопцамі робіць выхад амаль да самай вяршыні.

Кін-камінцы спыняюцца на развілцы дарог. Зноў перад групай выбар: налева пайсці — сцежка цяжкая, «больш небяспечная», але цікавейшая; направа — асфальтавая дарога. Камандзір выбірае дарогу, незадаволенасць у больш падрыхтаванай часткі групы расце.

Левінцы дабраліся да Лучыстага пазней за ўсіх. Над пасёлкам навісала захутаная хмарамі гара Дземерджы, збоку заставалася Даліна Прывідаў. Вось-вось павінна сцямнець. Бабулькі давалі такія ж канкрэтныя парады, як і Дубовіку: не лезьце, ідзіце і ўсё ўбачыце. Камандзір разважаў. Мне здавалася, што думае ён вельмі марудна, хацелася як мага хутчэй наверх, паглядзець гэтыя дзіўныя скалы, пафатаграфаваць, а Саша Анцыповіч яшчэ і падахвочваў:

— Яны і адсюль бачны здорава!

Саша вырашае ўзяць управа, крыху падняцца, двух чалавек пакінуць, каб ставілі палаткі, астатнім паглядзець Даліну Прывідаў. Мы ідзём. Я з трывогай пагладаю на сонца, якое апускаецца ўсё ніжэй. Здаецца, што крокі зрабіліся карацейшымі, што камандзір зноў вагаецца і мы так і не ўбачым да ночы Даліну Прывідаў. Унізе ўжо пачало цямнець. Нарэшце Саша з Валодзем засталіся, здалёк было відаць, як раптам зачырванела ля іх палатка, як потым з'явілася другая, а мы ўсё падымаліся і падымаліся.

Вось і першыя скалы дзівоснай формы, першыя здымкі. Не хацелася верыць, што папрацавалі тут толькі час, вада ды вецер. Але... сонца апошні раз хітравата падміргнула і схавалася недзе за пасёлкам. Мы былі яшчэ толькі ў пачатку Даліны Прывідаў, усё самае цікавае заставалася недзе наперадзе, а цемра ўжо агортвала больш аддаленыя скалы.

— Сяргей, уніз!

Як нажом па сэрцу мне гэтая каманда, яе не хочацца выконваць, я з жалем падаюся наперад, але... Нічога не зробіш, Даліну Прывідаў пабачу ў другі раз...



### ВЯРШЫНЯ ДЗЕМЕРДЖЫ. 5.XI.87.

ПЯЦЬ гадзін раніцы. Група Дубовіка ўжо на нагах. У шэсць гадзін пачынаецца пад'ём на вяршыню гары Дземерджы. Усё ахутана туманам, але камандзір учора дарогу разведаў і зараз ідзе ўпэўнена. І як толькі падняліся на вяршыню, з'явілася сонца. Рабяты стаялі зачараваныя — гэта ж першая ў іх жыцці пакароная вяршыня! А Сашу Карповічу сёння споўнілася яшчэ і васемнаццаць гадоў! Пакарыць Дземерджы ў свой дзень нараджэння — ці ж гэта не шчасце для сапраўднага мужчыны? Прама на вяршыні камандзір усіх павіншаваў з перамогай. Узнагародзіў кожнага цукеркай «Грыльяж», а Сашу Карповіча яшчэ і вялізнай шакаладкай, якую ён тут жа раздзяліў паміж таварышамі. Такія дні нараджэння незабываюцца ніколі.

Пятага лістапада групы раздзяліліся канчаткова: Дубовік і Левін пайшлі верхам, Кін-Камінскі з Лашуком выбралі асфальтавую дарогу.





### МЫ ВЫЙШЛІ ДА МОРА! 6.XI.87.

ВАДАПАД Джур-Джур. Да яго сапраўднае паломніцтва турыстаў, толькі і паспяваем адных абганяць, другім саступаць сцежку.

— Што іх сюды цягне? — не ўтрымліваецца хтосьці. Але праз некалькі мінут вадапад адкрываецца перад нашымі вачыма, і... знікае пытанне, што ж сюды прыцягвае турыстаў.

Група Дубовіка выйшла на бераг Чорнага мора. Многія наогул бачылі мора ўпершыню. Радасці іх не было мяжы. Нягледзячы на халадзіну, разуліся і пахадзілі па вадзе, некаторыя нават пакупаліся і паспрабавалі пазагараць. Нічога, што на вуліцы лістапад, галоўнае, што мора Чорнае!

Левінцы натыкнуліся на вінаграднае поле. Калі падышлі бліжэй, Саша Анцыповіч схапіўся за галаву:

— Колькі вінаграду засталося! Я ў сваім жыцці столькі не бачыў!

### ВЫНІКІ. 7.XI.87.

СІМФЕРОПАЛЬ. Апошняя агульная вячэра ў групе Левіна, камандзір падводзіць вынікі, выслухоўвае заўвагі. Агульная думка: паход удаўся, магчыма, не ўсё атрымалася, як хацелася, але затое склаўся цудоўны калектыў. І кожны з радасцю пачуў прапанову Левіна: гэтым жа саставам пайсці на Цянь-Шань.

У другім месцы знаходзяцца кін-камінцы і лашукоўцы. Кін-Камінскі моўчкі сядзіць у групе Лашука, потым павольна гаворыць:

— Развалілася мая група. Што цяпер рабіць?

Нехта не стрымліваецца:

— Што рабіць? Дамоў ехаць, усё роўна ўжо паход закончыўся...

...Чатыры групы, чатыры паходы...

**С. ПЛЫТКЕВІЧ.**
удзельнік паходу.
Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
3 снежня 1987 г.
Зак. 1597.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара З. А. АЛЯШКЕВІЧ.